Скідзель — невялічкі гарадок у 23 кіламетрах ад Гродна. Сярод больш-менш значных прадпрыемстваў можна вылучыць толькі два — цукровы завод і птушка-бройлерную фабрыку. На ёй і працуе бацька самага шматдзетнага скідзельскага сямейства Васіль Арсенцьевіч Камашаў. У сям'і Васіля і Рымы Камашавых 16 (!) дзяцей. Самаму малодшаму з іх, сыну Сашачку, — чатыры тыдні.

...Васіль Арсенцьевіч сустрэў мяне на скідзельскай аўтастанцыі. Пакуль на сямейным мікрааўтобусе Камашавых ехалі да іх дома, разгаварыліся. *"Карэспандэнты нашу сям'ю любяць,* — дзяліўся са мной Васіль Арсенцьевіч, — *часта прыязджаюць. Да гэтага ўсе дамашнія ўжо прызвычаіліся. Суседзі жартуюць, маўляў, раскажыце ім, Васіль Арсенцьевіч, што наша вуліца незаасфальтаваная, можа, асфальт пакладуць... Але я пра гэта журналістам не расказваю..."*

На вуліцы Вясенняй, дзе стаіць двухпавярховы цагляны дом Камашавых, і сапраўды асфальту няма. Праўда, магчыма, ён з'явіцца ў будучым годзе — Скідзель будзе адзначаць сваё пяцісотгоддзе.

У доме Камашавых шэсць пакояў. Кожны, хто пераступае парог дома, адразу чуе звонкія дзіцячыя галасы, якія даносяцца адусюль. Малодшанькія дзеткі адразу збягаюцца ў прыхожую — вывучаюць госця.

Распранаюся. Праходжу. Мяне сустракае гаспадыня — Рыма Мікалаеўна Камашава. Адразу прапануе перакусіць, маўляў, дарога са сталіцы няблізкая... Я ветліва адмаўляюся, на што Рыма Мікалаеўна адказвае: *"Добра, тады спачатку экскурсія па доме, а потым абед. З нашай хаты не прынята сыходзіць галодным".*

На першым паверсе дома — прасторная зала, дзе гаспадары прымаюць гасцей. Тут, акрамя канапы і крэслаў, стаіць піяніна. Усе дзеці ў сям'і маюць музычныя здольнасці, некаторыя пішуць музыку і вершы. Побач з залай пакой самага маленькага члена сям'і — Сашы. Тут стаіць яго ложачак. Па драўлянай лесвіцы падымаемся на другі паверх, які цалкам належыць дзецям. У дзіцячых спальнях — драўляныя ложкі стаяць у тры ярусы. Побач пісьмовыя сталы для дзяцей-школьнікаў. Цацкі для маленькіх акуратна складзеныя.

Дом Камашавы змаглі атрымаць ва ўласнасць, узяўшы льготны крэдыт, які ім выдзелілі мясцовыя ўлады: *"Будаваць дом доўга, а ў нас дзеці на руках. Таму адзінае выйсце, якое мы бачылі, — пакупка жылля. Бо дзецям трэба жыць зараз, а не тады, калі яны вырастуць"*, — гаворыць Рыма Мікалаеўна.

Да прыезду ў Беларусь сям'я Камашавых жыла ў Расіі і Казахстане.

...Рыма і Васіль пазнаёміліся ў пасёлку Какмож, што ва Удмурціі. Там жылі іх бацькі, а дзеці хадзілі ў адну і тую ж школу. Васіль Арсенцьевіч прызнаецца, што сваю будучую жонку заўважыў не адразу: *"Я заканчваў школу, а Рыма хадзіла ці то ў чацвёрты, ці то ў пяты клас. Школьніцай я яе не помню. Бацькі нашыя сябравалі, вось мы ў госці адзін да аднаго і хадзілі. Вырашылі стварыць сям'ю".*

Як гэта звычайна бывае, лёс сарваў маладых людзей з наседжанага месца. Яны пераехалі ў Казахстан да сваякоў: *"Я сама казашка па-нацыянальнасці, вось мы да радні і падаліся. Жылі ў Алма-Аце,* — гаворыць Рыма Мікалаеўна. — *Там наша сям'я і папаўнялася. У Казахстане — гэта звычайная рэч, там так прынята, што сем'і шматдзетныя. Пасля распаду Савецкага Саюза там стала зусім немагчыма. Муж, хоць і працаваў, але зарабляў зусім мала — 50 долараў у месяц. А ў той час у нас было ўжо 12 дзяцей, іх трэба было неяк карміць. Ніякай дапамогі на дзяцей я ў Казахстане не атрымлівала. Помню, як выпякала ўсялякія ўсходнія ласункі і старэйшыя дзеці разам са мной іх прадавалі... Усе веруючыя з нашай абшчыны сталі раз'язджацца хто ў Германію, хто ў Амерыку, мы выбралі Беларусь..."*

Трэба сказаць, што Камашавы — людзі веруючыя. Усе цяжкасці, якія выпадаюць ім у жыцці, яны ўспрымаюць як выпрабаванне, пасланае Богам. І яны ведаюць, што за гэта ім адплаціцца, бо свет не без добрых людзей. Спачатку яны хацелі вярнуцца ў Расію, аднак у сярэдзіне 1990-х гадоў кошты на жыллё там моцна падскочылі, а сродкаў, каб пабудаваць уласны дом у Расіі і даглядаць сям'ю, не хапала. А тут якраз іх знаёмыя перабраліся ў Беларусь. Услед за імі паехалі і Камашавы. Тут і абжыліся. Васіль уладкаваўся на птушкафабрыку, дзеці пайшлі ў школу...

У Беларусі старэйшая дачка Камашавых Кацярына выйшла замуж. У гэтым годзе ў яе нарадзіўся сын. Бацькі бываюць у гасцях у дачкі кожную нядзелю — яны разам ходзяць у царкву. Увогуле дзеці ў сям'і Камашавых выхоўваюцца ў біблейскай традыцыі. *"Дасканала растлумачыць, што такое добра, а што такое дрэнна, на мой погляд, можа толькі адна кніга — Біблія,* — гаворыць Рыма Мікалаеўна. — *У гэтай кнізе — дарога жыцця, ёсць адказы на ўсе пытанні. Калі чалавек спасцігае Біблію, ён спасцігае сэнс жыцця, і яму не трэба тлумачыць, што такое добра і што такое дрэнна".*

Акрамя агульнаадукацыйнай, дзеці наведваюць і нядзельную школу. Чытанне Бібліі ў сям'і Камашавых — добраахвотнае. Бацькі не прымушаюць дзяцей. Сказаць, што дзеці не дастаўляюць клопатаў сваім бацькам, будзе няправільна. Дзеці ёсць дзеці. Хтосьці набедакурыць у школе, хтосьці проста можа не паслухацца. *"Сваіх дзетак я не караю, ніколі не б'ю. Спрабую растлумачыць усё словам. Калі з першага разу не разумеюць, паўтараю яшчэ і яшчэ",* — у Рымы Мікалаеўны свае падыходы ў выхаванні.

Калі нешта здараецца ў школе, а яе наведвае пераважная частка дзяцей, Рыма Мікалаеўна рэдка ходзіць слухаць заўвагі настаўнікаў. За яе гэта робяць старэйшыя дзеці. Па шчырасці, у школе ўсе Камашавы на добрым рахунку — і па паспяховасці, і па паводзінах. Так што хвалявацца бацькам не варта.

Яшчэ адной асаблівасцю выхавання дзяцей у самай шматдзетнай скідзельскай сям'і — амаль поўная непрыманне дасягненняў цывілізацыі. У хаце няма тэлевізара, камп'ютэра. *"Тэлевізар быў, але навошта ён? Апошнім часам там толькі серыялы і ўсялякія непрыстойнасці паказваюць. Я лічу, тэлебачанне, як і вуліца, не можа навучыць нічому добраму. Няхай дзеці кнігі чытаюць, гэта лепей",* — катэгарычная ў сваім меркаванні Рыма Мікалаеўна.

Казаць пра тое, што ў доме нельга пачуць брыдкага слова, знайсці пачак цыгарэт альбо пляшку спіртнога, думаю, не варта: *"Канечне, цалкам засцерагчы дзяцей ад дрэннага я не магу. Яны ходзяць у школу, ходзяць у госці, можа, дзе і бачаць дрэннае. Але, не пераймаюць",* — з гордасцю гаворыць шматдзетная маці.

Як і любыя бацькі, Камашавы сваіх дзяцей балуюць. Праўда, гэта балаўство не тое, да якога прызвычаіліся іх сталічныя аднагодкі. Ніякіх табе дарагіх рэчаў, паходаў у МакДональдс, у цырк, на дыскатэку. Пабалаваць дзяцей у сям'і Камашавых азначае выехаць на сямейным мікрааўтобусе (які быў прыгнаны з Германіі) на возера ці па ягады-грыбы...

Звычайны распарадак дня унікальнай скідзельскай сям'і выглядае так.

Пад'ём у 6.30 раніцы. Старэйшыя будзяць малодшых і збіраюць іх у школу. Тыя, вярнуўшыся адтуль, дапамагаюць бацькам па гаспадарцы — убіраюць у хаце, мыюць, прасуюць, гатуюць ежу, робяць урокі, займаюцца музыкай, гуляюць у развіваючыя гульні...

Дарэчы, калі ехаў у Скідзель, задаваўся пытаннем: як удаецца пракарміць такую вялікую сям'ю? *"Калі з адзеннем прасцей, я сама швачка, да таго ж малодшым дастаецца адзенне старэйшых, то з ежай больш складана. Нам аднаго хлеба на дзень патрэбна пяць боханаў,* — гаворыць Рыма Мікалаеўна. І дадае: — *Я не скарджуся. І так спраўляемся. Муж, працуючы на птушкафабрыцы, мае магчымасць набываць танныя мясныя вырабы, садавіну-гародніну вырошчваем самі. Увогуле прадукты купляем рэдка. У асноўным усё сваё. Нашу сям'ю лета зіму корміць. Летам назапашваем садавіны, ставім на зіму гародніну, разпораз і хлеб самі выпякаем. У нас печка ёсць, але карыстаемся, шчыра прызнацца, ёй рэдка".*

Паколькі старэйшая дачка Камашавых Кацярына жыве ў Гродне і гадуе сына, на агульны фотаздымак яна не трапіла.

У пацвярджэнне сваіх слоў Рыма Мікалаеўна запрасіла за стол. Але на кухні ў вочы адразу кідаецца пліта — каб накарміць усіх гарачым і смачным абедам, трэба выкарыстоўваць ёмістасці аб'ёмам літраў пяць-сем. Што да рацыёна сям'і, то тут таксама ўсё ў поўным парадку: такога смачнага супу з капусты і грыбоў я ніколі ў жыцці не каштаваў. На другое — грэчка з салам і кансервванымі памідорамі, таксама смачна. Ну а запіць — на выбар: гарбата, кава, малако. Сям'я разам збіраецца рэдка, таму стала на восем персон хапае. А дзеткі, у якіх яшчэ ножкі, з канапы звісаючы, да падлогі не дастаюць, ядуць на спецыяльных міні-століках. Так, двухгадовая Васілінка, прымасціўшыся ля акна, з ахвотай ела грэчку. *"Вы ж бачыце, мы жывём, як усе, рацыён у нас нармальны, дзеткі здаровыя",* — гаворыць Васіль Арсенцьевіч.

Дзеткі ў Камашавых і сапраўды здаровыя. Праўда, калі не дай Бог захварэе адзін, то пакуль усе не перакашляюць, эпідэмія не адступіць. Лепшым за розныя лекі сродкам ад хваробы ў сям'і Камашавых лічыцца лазня. Нават самы малодшанькі, а значыць, на дадзены момант самы любімы Сашка, які нарадзіўся ў канцы студзеня, ужо некалькі разоў *"хадзіў"* у лазню...

Размаўляючы з Рымай і Васілём Камашавымі я ніяк не рашаўся задаць банальнае, але вельмі цікавае для мяне пытанне: "Ці думалі вы, што ў вас будзе 16 дзяцей?" Але Рыма Мікалаеўна адказала на яго сама: *"Жыццё — гэта самае дарагое, што можа даць жанчына. Канечне, я не думала, што ў мяне будзе столькі дзяцей. ЖЫЦЦЁ — ЯНО АД БОГА. Гэта шчасце, што Бог дае мне магчымасць дарыць жыццё сваім дзецям. І я ад гэтага не адступлюся. Пакуль будуць сілы і магчымасці..."*

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота аўтара.

Мінск—Скідзель—Мінск.

КСТАТИ

В Гродненском областном роддоме недавно родилась тройня. Три мальчика появились на свет у двадцатилетней жительницы г.Свислочь Вероники Маркушевской. Молодая пара, ожидавшая первенца, сразу стала многодетной семьей.

Вес малышей — 1900, 2150 и 2240 граммов. Состояние здоровья тройняшек опасений у медиков не вызывает. В стране в нынешнем году это первая тройня.

ПРАГНОЗ

Натуральныя страты насельніцтва — перавышэнне смяротнасці над нараджальнасцю — адбываюцца ў Беларусі з 1993 года.

Толькі сёлета праблема нацыянальнага маштабу была разгледжана на вышэйшым дзяржаўным узроўні. Хоць "Народная воля" біла ва ўсе званы і пяць, і сем, і дзесяць гадоў таму.

Знікаем, як снег пад сонцам

Колькасць насельніцтва Беларусі ў найбліжэйшыя 50 гадоў будзе памяншацца. Пра такія прагнозы паведаміў на пасяджэнні "круглага стала" ў Палаце прадстаўнікоў кіраўнік даследчай групы па дынаміцы і прагназаванні колькасці насельніцтва Венскага інстытута дэмаграфіі Аўстрыйскай акадэміі навук Сяргей Шчэрбаў.

Спецыяліст прывёў тры сцэнарыі дэмаграфічнага развіцця Беларусі. Першы заснаваны на існуючых дэмаграфічных паказчыках нараджальнасці, смяротнасці і міграцыі, другі адштурхоўваецца ад сітуацыі, калі ў краіне адбываецца ўзнаўленне насельніцтва (у кожнай сям'і — у сярэднім 2,1 дзіцяці). Трэці сцэнарый заснаваны на дэмаграфічных паказчыках, закладзеных у праект Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Беларусі на 2007—2010 гады: сумарны каэфіцыент нараджальнасці 11,4—11,5 на тысячу насельніцтва, сярэдняя працягласць жыцця — 70—72 гады, станоўчае сальда міграцыі — 5 тыс. чалавек.

Як паведаміў С.Шчэрбаў, у любой сітуацыі колькасць насельніцтва Беларусі будзе скарачацца; найбольшымі тэмпамі — пры першым сцэнарыі, найменшымі — пры трэцім. Акрамя таго, спецыяліст прагназуе непазбежнае старэнне насельніцтва Беларусі.

Паводле папярэдніх звестак, агучаных старшынёй пастаяннай камісіі ПП НС па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Алегам Вялічкам, у Беларусі на 1 студзеня 2007 года пражывала 9 млн 712 тыс. чалавек. Паводле яго слоў, за 2006 год колькасць насельніцтва скарацілася на 37,8 тыс. чалавек. Натуральныя страты насельніцтва — перавышэнне смяротнасці над нараджальнасцю — адбываюцца ў краіне з 1993 года.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

Разводаўстойлівы рэгіён

На Гродзеншчыне зарэгістравана менш за ўсё разводаў у Беларусі. А самыя сварлівыя сямейныя пары трапляюцца ў Гомельскай вобласці. Тут разводаў у паўтара раза больш.

Згодна са статыстыкай, найчасцей беларускі выходзяць замуж у 22 з паловай гады, а беларусы жэняцца — у 24 з паловай гады.

Дарэчы, беларусы згаджаюцца аформіць свае адносіны значна часцей, чым еўрапейцы. У шлюб у нас уступаюць амаль удвая часцей. Праўда, на 10 беларускіх вяселляў прыпадаюць 4 разводы.

Лілія ВОРАНАВА.

Падатак года

Брэсцкія ўлады ўвялі, мабыць, самы арыгінальны падатак года. Цяпер за размяшчэнне вонкавай рэкламы на замежных мовах трэба заплаціць у абласны бюджэт 10 базавых велічынь — 310 тысяч рублёў.

Такі "антызамежны" збор рэкламадаўцы будуць выплачваць штомесяц. Выдаткаваць грошы давядзецца аўтасалонам, прадаўцам бытавой тэхнікі, мабільнікаў, цыгарэт. Сярод плацельшчыкаў падатку на замежныя словы могуць аказацца нават беларусы Velcom і Gorizont, бо выкарыстоўваюць у рэкламе лагатып, напісаны лацінскімі літарамі.

Як стала вядома інтэрнэт-сайту www.marketing.by, у Гродне і Магілёве таксама збіраюцца ўвесці такі падатак на замежныя словы.

Двума генераламі болей

Аляксандр Лукашэнка прысвоіў званне генерал-маёра палкоўнікам **Аляксандру Балігатаву** і **Івану Гардзейчыку**. Аляксандр Балігатаў з'яўляецца намеснікам міністра абароны па тыле — начальнікам тылу Узброеных сіл Беларусі.

Іван Гардзейчык у ліпені 2006 года быў прызначаны начальнікам штаба — першым намеснікам камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных сіл.

Ул.інф.

На вольны хлеб

Колькасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў плануецца скараціць на 2 тысячы чалавек. Праўда, зэканомленыя сродкі пойдуць не на карысць бедных. Паводле інфармацыі прэс-службы Аляксандра Лукашэнкі, сродкі прадугледжваецца накіраваць на ўзмацненне тэхнічнай аснашчанасці ўсё той жа міліцыі.

Ул.інф.

ІНТЭРНЕТ

Пасткі ў Сусветнай павуціне

Беларусь пайшла на меры па кантролі за Інтэрнетам. Кіраўнікі інтэрнет-кафэ і камп'ютэрных клубаў абавязаны весці электронны журнал даменных імён сайтаў, да якіх карыстальнікі атрымлівалі доступ. Тэрмін захоўвання электроннага журнала складае не менш за 12 месяцаў. Кіраўнік інтэрнет-кафэ або ўпаўнаважаная ім асоба абавязаны прадастаўляць доступ органам дзяржаўнай бяспекі, праваахоўным органам і органам дзяржаўнага кантролю да гэтага журнала.
Дадзенае рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў №175.

"Гэта пастанова носіць папераджальны характар: тыя, у кагo з'яўлялася жаданне выкарыстаць ананімнасць Інтэрнета ў незаконных мэтах, зараз, магчыма, не захочуць гэтага рабіць", — так пракаментаваў БелаПАН начальнік Цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі Валерый Надтачаеў рашэнне ўрада.

Падкрэсліўшы, што КДБ не займаўся распрацоўкай дадзенай пастановы, В.Надтачаеў адзначыў яе мэтазгоднасць.

Пастанова атрымалася гучнай, але... не страшнай. Як сцвярджаюць спецыялісты, чарговы метад кантролю за працай інтэрнет-кафэ і клубаў можа аказацца не такім дзейсным, як спадзяюцца ўлады. *"Яшчэ пяць гадоў таму нас абавязвалі рэгістраваць не толькі сайты, што наведваюць карыстальнікі, але і іх [карыстальнікаў] пашпартныя звесткі. І хаця тое распараджэнне было часовым і юрыдычнай сілы не мела, мы сапраўды нейкі час займаліся рэгістрацыяй наведвальнікаў. У адваротным выпадку ўзнікалі праблемы на ўзроўні адміністрацый раёнаў",* — паведаміў ананімны суразмоўца агенцтва БелАПАН. Паводле яго слоў, ва ўсіх інтэрнет-кафэ ёсць гэтак званыя прокси-серверы, або фіксацыя даменных імён сайтаў, якія наведалі карыстальнікі. Гэта тэхналагічна неабходна для правільнага адсочвання трафіка.

Паводле слоў уладальніка кафэ, заўсёды мелі месца і запыты ад прадстаўнікоў дзяржорганаў у інтэрнет-клубы, прычым мэты гэтых запытаў, як правіла, не паведамляюцца. Такую інфармацыю інтэрнет-клубы прадастаўляюць толькі ў выпадку афіцыйнага да іх звароту, падкрэсліў суразмоўца.

Ён таксама паведаміў, што ў большасці клубаў вядзецца відэаназіранне, а звесткі захоўваюцца як мінімум месяц. Такім чынам, калі дзяржорганы выказваюць цікавасць да канкрэтнага наведвальніка, яны могуць даведацца, які сайт і з якога камп'ютэра ён наведваў.

Пры гэтым суразмоўца зазначыў, што сёння інтэрнет-кафэ ў Беларусі — адзінае месца, якое больш-менш забяспечвае канфідэнцыяльнасць. *"Пакуль нас зноў не прымусілі фіксаваць пашпартныя звесткі, інтэрнет-кафэ забяспечваюць нейкую ананімнасць. Калі ж вы выходзіце ў сетку праз гарадскі або мабільны тэлефоны, то заўсёды можна адсачыць шлях карыстальніка, бо тэлефоны зарэгістраваныя на канкрэтнага чалавека",* — дадаў ён.

Алена СПАСЮК.

РЕАЛЬНАЯ ЭКОНОМИКА

Все хорошо, только платить нечем

Не оправдалась уверенность специалистов Министерства энергетики Беларуси в стопроцентной оплате промышленными потребителями использованных в январе энергоресурсов. Более 2,6 тысячи промышленных потребителей с энергоснабжающими организациями рассчитаться не могут.

Большинство неплательщиков — малые и средние предприятия, в том числе расположенные в районных центрах, малых городах и на селе. *"Новые тарифы, рассчитанные исходя из повысившихся в 2007 г. входящих цен на импортируемую электроэнергию и природный газ, были доведены до реального сектора экономики 29 января, и целый ряд предприятий оказался не в состоянии изыскать разницу между ранее действовавшими и новыми тарифами",* — цитирует "Интерфакс" главного специалиста государственного производственного объединения "Белэнерго" Владимира Кордубу. Специалист уточнил, что *"фактически непогашенной остается именно эта разница в цене".*

"Белэнерго" уже направил всем неплательщикам предупреждения о необходимости погасить задолженность за потребленные энергоресурсы. *"Некоторые руководители, представив в концерн расчеты и подтверждения экономической состоятельности предприятия, попросили отсрочки и предоставили графики погашения задолженности. В отношении остальных субъектов хозяйствования, в особенности тех, где производство падает или имеет низкие темпы прироста, мы будем вынуждены принять ограничительные меры",* — уточнил В.Кордуба.

В соответствии с заключенными на 2007 г. контрактами Беларусь должна ежемесячно авансировать поставки электроэнергии из России и Украины, а также своевременно рассчитываться за поставленный природный газ. *"Возникающая угроза неплатежей может спровоцировать неприятности в оплате природного газа и приведет к отсутствию средств по авансированию оплаты импортируемой электроэнергии",* — сообщили в "Белэнерго". В сложившейся ситуации перераспределение уже поступивших средств для полной оплаты по одной из вышеуказанных статей расхода невозможно. *"Если отсрочить авансирование платежей по электроэнергии, у нас все равно не хватит средств, чтобы рассчитаться за поставленный в январе газ",* — сказал В.Кордуба.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 ЛЮТАГА 2007 г.

ПОДСЧИТАЛИ

Экономика Беларуси пошла вразнос

Только за первый месяц текущего года темп роста цен производителей почти вдвое превысил рост за весь предыдущий год. Как сообщило Министерство статистики и анализа, индекс цен производителей промышленной продукции в Беларуси в январе 2007 года составил 116,5% к декабрю 2006 года, тогда как за весь 2006 год цены на промышленную продукцию выросли на 8,5%.

Такой беспрецедентный рост цен на продукцию промышленного производства может угрожающе сказаться на потребительских ценах в будущем, считают эксперты Агентства финансовых новостей. Уже за январь цены выросли на 1,8%, что также превышает среднемесячный темп роста потребительских цен по итогам 2006 года. При этом стоит отметить, что в Беларуси в последние годы рост цен на промышленную продукцию обычно превышал рост индекса потребительских цен, но не более, чем на 1—2 процентных пункта. В данном случае речь идет о более чем восьмикратном превышении.

Сейчас уже можно однозначно говорить, что экономика Беларуси в январе не справилась с ростом цен на газ, особенно если сравнивать с Украиной, которой в 2006 году пришлось пережить аналогичное повышение. По итогам всего 2006 года рост цен на промышленную продукцию в Украине составил 14,1%, то есть меньше, чем в Беларуси только за январь. Рост потребительских цен в Украине в 2006 году составил 11,6%, при этом в январе 2006 года рост цен составил 1,2%.

И все это несмотря на жесткое регулирование цен в нашей стране. На слуху постановление Совмина Беларуси о предельных индексах отпускных цен, рост которых не должен превышать 0,5% в месяц. Но текст этого документа до сих пор никто толком в глаза не видел и даже не знает его номера. И хотя постановление датировано 30 декабря 2006 года, очевидно, что принято оно было задним числом, так как информация о нем появилась только в начале февраля. Существует лишь разъяснение Министерства экономики по этому поводу, и только на сайте ведомства в Интернете. Можно ли это считать официальным документом в стране, где никто не верит факсимильной копии документа? Сложно ответить на этот вопрос и не только.

Позволят ли теперь производителям оставить цены на том уровне, до которого они были подняты в январе, или заставят отмотать назад — неизвестно. Впрочем, в наших новых ценовых правилах — в этом сверхсекретном документе — для предприятий есть "отмазки". Так, цены разрешено увеличивать сверх норматива тем, кому угрожают убытки, а убытки, судя по всему, у нас в этом году угрожают всем.

www.afn.by

АФІЦЫЙНА

50 цэнтаў — за гадзіну працы

Урад Беларусі ўстанавіў месячную мінімальную заработную плату з 1 студзеня 2007 года ў памеры 179 тысяч 50 рублёў. Гэта рашэнне прынята "заднім днём" і ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў №182.

Гадзінная мінімальная заработная плата ўстаноўлена ў памеры 1 тысячы 60 рублёў.

Нагадаем, што існуе рэкамендацыя ААН, згодна з якой мінімальная пагадзінная аплата працы не павінна складаць меней за 1 долар ЗША. Беларусь, хвалячыся поспехамі ў эканамічнай сферы, так і не здолела яе выканаць.

Лілія ВОРАНАВА.

Не быць храму забойцы!

Па ініцыятыве МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" распачата грамадзянская кампанія супраць будаўніцтва храма-помніка ў гонар расійскага палкаводца Аляксандра Суворава на беларускай зямлі.

Як стала вядома, будаўніцтва ўжо распачата ў Кобрыне пры падтрымцы Рускай праваслаўнай царквы. Аднак ацэнка незалежнымі гісторыкамі дзеянняў расійскага палкаводца А.Суворава на беларускай зямлі адназначная: менавіта пад яго кіраўніцтвам надзвычай жорстка падаўляліся вызвольныя паўстанні канца XVIII ст., здзяйсняліся злачынствы супраць мірнага насельніцтва.

Суворaў на штыках прынёс прыгоннае права на тэрыторыю Беларусі. МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" выступае супраць узвядзення храма-помніка, які ў вачах беларусаў стане сімвалам апраўдання кровапраліцця ў інтарэсах захавання імперскай улады.

Да кампаніі, распачатай "Бацькаўшчынай", ужо далучыліся грамадскія аб'яднанні "Саюз беларускіх пісьменнікаў" і "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".

20 лютага ад імя трох названых аб'яднанняў накіраваны адкрыты ліст да Патрыяршага Экзарха Беларусі мітрапаліта **Філарэта**, а таксама звароты да прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь **Сяргея Сідорскага**, упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў **Леаніда Гулякі**, да старшыняў Брэсцкай абласной і Кобрынскай гарадской выканаўчай улады і да саветаў дэпутатаў з патрабаваннем спыніць будаўніцтва храма-помніка ў гонар забойцы беларусаў.

Алег СНОЎ.

ЧУЛІ?

Беларускія міратворцы рыхтуюцца ехаць у Албанію

У 2007 годзе пачынаецца актыўная падрыхтоўка ваеннаслужачых міратворчай роты 120-й асобнай механізаванай брыгады ва Уруччы. Пра гэта на сустрэчы з журналістамі ў Барысаве (Мінская вобласць) паведаміў камандуючы Сухапутнымі войскамі генерал-маёр Аляксандр Нікіцін.

Паводле яго слоў, на гэты год запланавана правядзенне трох месячных збораў для ваеннаслужачых гэтай роты. Рота была створана ў 2004 годзе пасля далучэння краіны да працэсу планавання і ацэнкі сіл у рамках праграмы НАТО "Партнёрства дзеля міру".

Зараз рота ўкамплектавана па штаце мірнага часу. У выпадку неабходнасці яна будзе разгортвацца да колькасці, *"вызначанай пад канкрэтныя задачы"*, зазначыў А.Нікіцін.

У яе склад могуць увайсці мотастралковая рота колькасцю ад 80 да 100 чалавек, патрульны ўзвод (20—30 чалавек) і група кіравання. Міратворчая рота ўкамплектаваная афіцэрамі і ваеннаслужачымі-кантрактнікамі розных спецыяльнасцяў: сапёрамі, медыкамі, ваеннаслужачымі патрульна-паставой службы са складу ваенных камендатур. 155 ваеннаслужачых міратворчай роты прайшлі навучанне на моўных курсах і курсах спецпадрыхтоўкі ў Германіі, Швейцарыі, Швецыі. А.Нікіцін падкрэсліў, што рота забяспечана самымі дасканалымі сродкамі сувязі і назірання, добра экіпіравана, на яе ўзбраенні знаходзяцца БТР-80.

Зараз беларускія міратворцы рыхтуюцца браць удзел у міжнародных вучэннях, якія пройдуць у Албаніі.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Пераабуванне

Міністэрства абароны Беларусі абвясціла, што намерана адмовіцца ад ботаў і анучаў. Аб'ява была зроблена ў разгар прызыву.

Цяпер салдаты будуць абувацца ў сучасныя армейскія чаравікі і шкарпэтки. Такія змены міністэрскія работнікі тлумачаць пытаннем гігіены вайскоўцаў.

Дарэчы, ва ўкраінскім войску анучы адменены ўжо з восеньскага прызыву. Беларускім салдатам давядзецца панасіць іх крыху даўжэй. Прынамсі, міністэрскія чыноўнікі пакуль не назвалі дакладных тэрмінаў пераабування вайскоўцаў.

Ігар МАРОЗАЎ.

ІНІЦЫЯТЫВА

Рыхтуецца амністыя

Аляксандр Лукашэнка даручыў Міністэрству ўнутраных спраў прапрацаваць пытанне аб амністыі грамадзян, *"якія ўчынілі менш цяжкія злачынствы і сталі на шлях выпраўлення"*. Адпаведнае даручэнне дадзена міністру ўнутраных спраў Уладзіміру Навумаву.

Ул.інф.

Хто з палітзняволеных патрапіць пад амністыю?

На гэта пытанне прэс-цэнтру Хартыі-97 адказалі вядомыя праваабаронцы.

Адвакат Аляксандр Галіеў, які абараняў лідэра незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Зміцера Дашкевіча, лічыць, што Дашкевіч мае шанц вызваліцца датэрмінова. *"Калі знімуць год паводле амністыі, а паўгода ён ужо адбыў, то пасля прыняцця закона аб амністыі Дашкевіч мусіць вызваліцца, бо ягоны прысуд — паўтара года"*, — кажа адвакат. Але пры гэтым нагадвае, што адміністрацыя калоніі будзе ўлічваць і паводзіны асуджанага. Зміцер атрымаў ужо два спагнанні.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч як вялікія ацаніў шанцы на вызваленне ўсіх палітвязняў, акрамя Аляксандра Казуліна. *"Калі будзе амністыя, то выйдуць на волю Фінькевіч, Севярынец, Статкевіч, якія фактычна свае тэрміны ўжо амаль адбылі, і амністыя іх цалкам паглыне. Гэтаксама і Садоўская — тым больш яна падпадзе пад асобную групу асуджаных: жанчыны сталага веку. А вось з Казуліным будзе праблема, бо 5,5 года пакарання ніводная амністыя не пагасіць. Хіба што яго персанальна Лукашэнка памілуе"*, — кажа праваабаронца.

Як патлумачыў адвакат Казуліна Ігар Рынкевіч, ягоны падабаронны не прызнае сябе вінаватым і дамагаецца не амністыі ці ўмоўна-датэрміновага вызвалення, а цалкам адмены прысуду.

НАВІНКА

У Беларусі створаны дазіметр для выяўлення стронцыю

Дагэтуль выявіць стронцый было немагчыма. Спектрометр бета-гама выпраменьванняў чалавека зрабілі супрацоўнікі Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага універсітэта імя Сахарава.

Гэтая прылада, па словах навукоўцаў, не мае айчынных аналагаў і пераўзыходзіць найлепшыя сусветныя ўзоры. Сёння дозы апраменьвання фарміруюцца за кошт доўгага назапашвання радыенуклідаў. Як правіла, у арганізме назапашваецца стронцый-90. Гэты небяспечны элемент адкладваецца ў касцявой сістэме і практычна не выводзіцца. Да таго ж большасць дазіметраў вымяраюць гама-выпраменьванні, а крыніцай выпраменьвання стронцыю-90 з'яўляюцца бета-часцінкі, паведамляе Еўрапейскае радыё для Беларусі.

БОЛЬ

Поколение, которого не стало

Душевная боль и огорчение за людей, называемых бывшими совершеннолетними узниками нацизма, не дает мне покоя и в настоящее время в очень пожилом возрасте. Их судьба вошла в биографию моей жизни: связная партизанского отряда, минская тюрьма, концлагерь, после освобождения участие в боях за Берлин. Имею правительственные награды.

Очень многие бывшие совершеннолетние узники нацизма так и не смогли получить соответствующие документы об их причастности к борьбе за свободу своей Родины. Их свидетели могли погибнуть, сменить местожительство или им могли отказать в их просьбе.

Политическая и психологическая атмосфера среди людей в послевоенный период была против всех, кто был насильно вывезен в Германию, независимо от мест их пребывания там.

В конце 80-х годов руководители бывшего советского государства признали лишь бывших несовершеннолетних узников нацизма и включили их в закон о ветеранах. Никакие попытки признать всех бывших узников нацизма равными с их детьми не дали результата. Только в 90-е годы по настоянию общественности были узаконены бывшие совершеннолетние узники концлагерей.

Ни одно дерево не растет без корней. Вызывать обиду одного поколения на другое неизбежно приведет к нарушению их преемственности. Исторически оправдано не давать характеристику людям только в одной краске — получим неживых людей. Следует выбирать не героев, а эпоху и раскрывать ее в поступках человека, связанных с тем или иным чрезвычайным событием.

В Кёльне (Германия) создан "музей-тюрьма", специально для восточных рабочих. Изучая надписи на стенах камер, поражаешься мужеством обреченных на смерть людей, их высоким чувством патриотизма и любви к своей Родине. Живым из той тюрьмы не вышел никто. Наш народ не знает, сколько бывших совершеннолетних узников нацизма были брошены в концлагеря и расстреляны в тюрьмах за неповиновение фашистскому режиму в самой Германии. Надо было иметь смелость и мужество поступать так. Восстание в концлагере Бухенвальд было поднято совершеннолетними узниками, включая военнопленных. А казнь генерала Карбышева? Нам нечего стыдиться своей истории. Подлецов и негодяев в любую эпоху хватало. Они не затмевали историю народа, а утверждали ее.

Вызывает удивление, что инициативу взаимопонимания и примирения проявляет не наша страна, а Германия, третье поколение тех, кто принес нашему народу горе и страдания.

В федеративном законе о так называемой "компенсации" за рабский труд не было упоминания о бывших несовершеннолетних узниках нацизма. Немало усилий пришлось приложить председателю правления Белорусского республиканского фонда "Взаимопонимание и примирение" В.Я.Герасимову, чтобы Германия согласилась приравнять их по выплатам к совершеннолетним узникам. В своих выступлениях В.Я.Герасимов всегда отмечал, что Беларусь в военные годы представляла собой концлагерь, обнесенный колючей проволокой, а земля являлась братской могилой граждан всех национальностей.

Великая Отечественная война стала самым трагичным событием в истории нашей Родины. Из-за внезапности нападения на нашу страну многим из нас пришлось сменить школьную форму на военную и с честью выполнить свой долг в освобождении своей страны от фашизма. Для каждого честного человека личная судьба и судьба Отечества в то время были неразделимы. И здесь огромная роль принадлежит истории честно отразить доблесть своего народа. Право искажать эту историю не дано никому. Образ защитника Родины отложился в душах десятков тысяч людей и взывал к мужеству и патриотизму. Гражданское население в июне 1941 года осталось незащищенным на оккупированной территории не по своей воле. Те, кто не надел военную форму, пришли к осознанию своей причастности к всенародной борьбе с врагом. Примером этому служила широкая сеть подпольных организаций и невиданное по своему размаху партизанское движение в Беларуси. И это оправдано, так как все предыдущие поколения воспитывались на героическом прошлом наших предков, на преемственности поколений.

Известно, что на оккупированной территории гражданское население столкнулось с политикой "сожженной земли", проводимой оккупантами. Враги хотели лишить наш народ будущего и насильственно увозили нашу молодежь в Германию. Патриотически настроенное гражданское население вешали на устрашение другим, расстреливали, бросали на пытки в тюрьмы, вывозили в концлагеря на рабский труд. Чтобы предотвратить связь с партизанами, сжигали целые деревни и часто с их жителями, о чем свидетельствует мемориальный комплекс "Хатынь". В других случаях жителей сгоревших деревень эшелонами отправляли в Германию. Это история страны и ее незачем стыдиться. Это не ошибка людей, которых советская власть не защитила. Это ошибка бывших руководителей советской власти, привыкших свою вину перекладывать на других.

С появлением общественных организаций бывших несовершеннолетних узников нацизма приравняли к участникам Великой Отечественной войны, сколько бы им дней, месяцев, лет ни было. А бывшие совершеннолетние узники от 18 и выше были отнесены к категории военнопленных. Ни в одной стране, оккупированной немцами в годы Второй мировой войны, такое абсурдное деление рабов рейха по возрасту не имело места. Никому и в голову не приходило разделять детей и родителей. Этим еще больше усугубило отсутствие взаимопонимания между истинными участниками Великой Отечественной войны и приравненными к ним бывшими несовершеннолетними узниками нацизма.

Жертвами нацизма было старшее поколение, косвенно причастное к поражению нацистских войск на фронтах, так как немецкую армию необходимо было держать и на оккупированной территории, особенно в Беларуси. Поэтому приравнивать к участникам войны следовало бы старшее поколение, а не малолетних детей. В одной семье жили признанные государством бывшие несовершеннолетние узники и их родители. Ни один несовершеннолетний узник не вступился за свою мать, отца, за память о родителях, погибших на чужбине, которые сделали все, чтобы сохранить жизнь своих детей. За могилами, оставшимися в чужой земле, ухаживают люди с добрыми сердцами.

Очень много детей вернулось на Родину сиротами. Они испытывали трудности послевоенного периода, как и весь наш народ. Малолетние узники еще не успели понять, что старшее поколение шло на смерть, заведомо зная, что они могут погибнуть, но шли во имя свободы своей Родины. Их дети не могли еще осознать достоинство старшего поколения.

Истории известны проявления мужества наших детей в годы войны. Это зафиксировано в памятниках и экспозициях в музеях. Нужно отдать дань их детскому патриотизму. А основная масса малолетних узников нацизма редко в своих выступлениях вспоминают о доблести собственных родителей. Руководители их организаций и они сами убеждены, что государство дало им льготные права по достоинству, а беда бывших совершеннолетних узников нацизма в том, что они, мол, сами не могли добиться своего признания. В этом политическая близорукость бывших несовершеннолетних узников и отсутствие понимания доблести народа. В отношении к детям лежит чувство жалости. А разве дети погибших фронтовиков, погибших партизан, дети, работавшие на оборону своей страны, не были лишены детства и даже юности? Разве они не познали голод и холод? Они тоже хотели жить в тепле и ощущать радость детства. Но их не приравняли к доблестным защитникам Отчизны. Эти категории детей можно было отнести просто к "детям войны". Но все эти вопросы бывшие руководители советского государства легко решили по стереотипу.

Политика бывшего СССР по отношению к военнопленным хорошо известна всему миру. Менять эту политику в те годы никто не собирался и применили ее к совершеннолетним узникам нацизма. Поводом для такого решения был отказ товарища Сталина от своего сына, плененного немцами в годы войны. Это и было толчком к появлению целого поколения "павликов морозовых". И создание общественных организаций с уставами, не предусматривающими прием бывших совершеннолетних узников нацизма, было в русле политики коммунистической партии.

Не зря говорят, что достоинство родителей — наследство их детей. А какое историческое значение этих детей, достигнувших пожилого возраста? Н.Г.Чернышевский писал: *"Историческое значение каждого человека измеряется его заслугами перед Родиной, а его человеческое достоинство — силою патриотизма"*.

Бывшее руководство советского правительства помогло нарушить патриотическую преемственность старшего и молодого поколений. Этот раскол существует в законах и нашей республики по сегодняшний день.

Стратегия любого закона закрепляется конституцией, обеспечивающей своих граждан уверенностью в завтрашнем дне. Эта уверенность является основой воспитания молодого поколения в духе исторической преемственности старшего и младшего поколений. Нарушение такой преемственности приводит молодое поколение к отсутствию взаимопонимания между:

1.родителями и детьми в семьях;

2.совершеннолетними и несовершеннолетними узниками нацизма в плане общей борьбы за независимость нашей Родины;

3.истинными участниками Великой Отечественной войны и приравненными к ним бывшими несовершеннолетними узниками нацизма;

4.всеми детьми войны и своим местом в истории военных и послевоенных лет;

5.своей судьбой и судьбой жителей сожженных деревень оккупантами;

6.своей судьбой и судьбой советских солдат, плененных не по своей воле;

7.своей судьбой и судьбой детей блокадного Ленинграда.

Эти проблемы не выпали из поля зрения немецкой стороны. По инициативе посла Федеративной Республики Германия господина Мартина Хеккера и его супруги госпожи Анны-Марии Хеккер было проведено мероприятие при поддержке Совета ветеранов войны и труда, посвященное сближению ветеранов войны и приравненных к ним несовершеннолетних узников нацизма. Обобщений не последовало.

Следует понимать, что война между народами может порождать такие противопоставления, но не закон. Правовая сторона закона должна быть направлена на защиту прав и свобод всех граждан. Закон, выделивший только бывших несовершеннолетних узников фашизма, был "уступкой" в холодной войне международному движению жертв фашизма, получившему широкое распространение в западных странах Европы и Америке. Неизвестно еще, каким результатом ответит история Великой Отечественной войны на потерю поколения бывших совершеннолетних узников фашизма в нашей республике. В России и в Украине уже около трех лет нет разделения жертв фашизма по возрасту. Данный закон закреплен в конституциях этих республик.

Исключительность тех или иных категорий населения устанавливается уставами общественных организаций и фондов, общественная деятельность которых регулируется политической, экономической и социальной политикой нашего правительства, но не в ущерб принципам преемственности поколений.

Нельзя умалчивать исторические факты. Их необходимо предвосхищать в политике воспитания молодого поколения для сохранения исторического патриотизма их отцов, доблесть и мужество которых необходимы для молодежи во имя преемственности старшего и младшего поколений любить и ценить миролюбивую политику нашего государства и быть готовыми защитить его.

Ольга Александровна НЕХАЙ,
руководитель Белорусского общественного объединения бывших узников фашизма "Лёс".

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 ЛЮТАГА 2007 г.

ФОТООКНО

Кто?

Кто же станет преемником Путина?
В поисках ответа СМИ анализируют громкие перестановки в российском правительстве.

Как известно, Владимир Путин назначил вице-премьера и министра обороны Сергея Иванова первым вице-премьером, курирующим оборонно-промышленный комплекс. Новым военным министром стал глава Федеральной налоговой службы Анатолий Сердюков.

Газеты, которые пишут на эту тему, едины в одном — теперь аппаратный вес обоих потенциальных преемников Владимира Путина — Дмитрия Медведева и Сергея Иванова — и их шансы занять президентское кресло уравнены.

Один из чиновников в Администрации президента так ответил на вопрос газеты "Коммерсант" о том, является ли новое назначение Сергея Иванова повышением или понижением: "Это не просто повышение. Это расширение всех горизонтов".

"Коммерсант" считает, что уход из Минобороны позволит Сергею Иванову избавиться от целого шлейфа проблем, серьезно омрачавших его президентские перспективы. *"Теперь же на неприятные вопросы об изувеченных призывниках, утонувших подлодках или взорвавшихся ракетах придется отвечать новому гражданскому министру обороны Анатолию Сердюкову,* — отмечает газета. — *А Сергей Иванов сможет полностью сосредоточиться на создании у россиян светлого образа творца российской "инновационной экономики".*

Новое назначение бывшего министра обороны британская газета Financial Times оценивает как повышение и считает, что таким образом Владимир Путин уравнял шансы двух фаворитов предстоящей президентской гонки.

Более либерально настроенный Дмитрий Медведев, указывает газета, пока опережает в социологических опросах своего соперника, который считается ставленником фракции силовиков в Кремле. Газета приводит мнение бывшего вице-премьера Бориса Немцова, который считает, что назначение Иванова — знак предпочтения его в качестве возможного преемника Путина и удар по более либеральному крылу кремлевских политиков, стоящему за Медведевым.

КОРОТКО

Немцы проспали

По словам дочери второго лица государства, секрет избавления ее отца от лишних килограммов прост: *"Работа с восьми утра до двенадцати ночи. Плюс забота жены. Все".*

И понимай слова Оксаны Сидорской как хочешь!..

Не так давно многие средства массовой информации написали о том, что у **Джорджа Буша** на виске появились две новые родинки и он обратился к врачу. Медики, не выявив никаких онкологических проблем, порекомендовали Бушу их удалить. Он согласился на операцию.

Об этом рассказали все газеты.

В минувшем году американские журналисты сообщили, что **Кондолиза Райс** перенесла гинекологическую операцию. Она также не делала из этого тайны...

А белорусские чиновники и члены их семей настолько чем-то (или кем-то?) запуганы, что боятся вслух говорить о самых элементарных вещах, никоим образом не связанных с политикой! Порой самые простые вопросы вводят их в ступор!

Кстати, на днях в Интернете на одном из сайтов *"из источников, заслуживающих доверия"*, появилась информация о том, что будто бы мужу дочери Сидорского доверили *"весьма прибыльный, но и весьма криминальный бизнес при "большой трубе"*. Соответствует ли эта информация действительности — неизвестно.

Имеет ли зять Сидорского какое-то отношение к нефтяному бизнесу — неизвестно.

Высокопоставленные чиновники и члены их семей охотно общаются с журналистами из негосударственной прессы лишь в одном случае — когда уходят в отставку или когда над их головой сгущаются тучи...

Марина КОКТЫШ.

ВІНШУЕМ!

«Гліняны Вялес» прысудзілі Валянціну Акудовічу

Адна з самых вядомых нонканфармісцкіх літаратурных прэмій "Гліняны Вялес" — за 2006 год прысуджана філосафу і эсэісту Валянціну Акудовічу за кнігу "Дыялогі з Богам", якая пабачыла свет летась у выдавецтве Логвінава.

Пра гэта "Народнай волі" паведаміў старшыня незарэгістраванай арганізацыі "Таварыства вольных літаратараў" Алесь Аркуш.

Прэмію заснавалі сябры ТВЛ яшчэ ў 1993 годзе, і з таго часу нязменна штогод вызначаецца лаўрэат за найлепшую, па меркаванні "тэвээлаўцаў", мастацкую кнігу. У якасці ўзнагароды лаўрэатам уручаецца скульптурная гліняная выява Вялеса — старажытнага паганскага бога, які апекаваўся мастацтвам. А ў гэтым годзе пераможца атрымае карціну мастачкі Таццяны Козік.

Сёлета на атрыманне прэміі таксама намінаваліся кнігі: *"Белы конь"* **Міхася Андрасюка,** *"Імя грушы"* **Сяргея Балахонава**, *"Фараон у заапарку"* **Зміцера Вішнёва** і *"Сто лі100ду на TUT.BY"* **Андрэя Хадановіча.**

Сярод ранейшых уладальнікаў "Вялеса" — **Уладзімір Арлоў, Алесь Разанаў, Сяргей Дубавец.**

Лаўрэат вызначаецца шляхам апытання *"сталых экспертаў"*, паведаміў Аркуш, але хто і за каго прагаласаваў, не паведамляецца — *"гэта ў нашым крыўдлівым літсвеце бяспечней для экспертаў".*

Традыцыйна прэмія ўручаецца ў сакавіку ў Полацку, але сёлета чамусьці плануецца наладіць вечарыну з гэтай нагоды ў Беластоку.

Вальжына КОРСАК.

ЧУЛІ?

Аладзін загаварыў па-беларуску

Чароўны свет персідскай казачнай эпапеі "Тысяча і адна ноч" ажыў у новым спектаклі Беларускага тэатра "Лялька" ў Віцебску. П'еса Ніны Гернет "Аладзін" у бліскучай пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра **Віктара Клімчука** з арыгінальнай музыкай **Алега Залётнева**, сцэнаграфіяй галоўнага мастака "Лялькі" **Алеся Сідарава** і касцюмамі **Ганны Сідаравай** выклікае захапленне і маленькіх, і дарослых гледачоў.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

КИНОВЕСТИ

Проблемный «Беларусьфильм»

Нынешний руководитель "Беларусьфильма" Владимир Заметалин является шестым генеральным директором Национальной киностудии, назначенным на эту должность за последние 12 лет.

Столь частая ротация свидетельствует о кризисе кадров в сфере управления кинематографом. Однако киноцейтнот, на который в минувшем году вдруг обратили внимание государственные средства массовой информации, имеет более глубокие причины...

Вот некоторые подсчеты. С 1992-го по 2006 год на "Беларусьфильме" за бюджетные средства снято 47 полнометражных игровых фильмов (из них около 10 совместных с Россией или при ее участии; добавим 3 телефильма по 4 серии).

А теперь вопрос: сколько кинолент имели общественный резонанс?

(Замечу, что об окупаемости речь вообще не идет — эта категория только-только начинает входить в обиход белорусских управленцев и кинопроизводителей...)

В Беларуси и в России хорошие отклики имели *"Кооператив Политбюро, или Будет долгим прощание"* (1993), *"В августе сорок четвертого..."* (2000) **Михаила Пташука**. В нашей стране можно говорить об успехе *"Анастасии Слуцкой"* (2002) режиссера **Юрия Елхова**. Несмотря на то, что года два картина была чем-то вроде государственного штандарта и ее обязывали смотреть учащихся и студентов, одновременно обнаружился и неподдельный интерес зрителей к "Анастасии Слуцкой". Картина ответила на социальные ожидания и показала, что республиканская аудитория нуждается в лентах, посвященных минувшему нации и ее историческим фигурам (велика или мала эта аудитория, можно проверить только путем социологического опроса, но тенденция налицо). Создано несколько фильмов, которые я обозначила бы как имевшие неплохой потенциал, но так и не доведенные до высоких художественных кондиций (*"Еще о войне"* дебютанта в режиссуре **Петра Кривостаненко** и *"Дунечка"* **Александра Ефремова;** оба поставлены в 2004 году). В связи с дефицитом детских фильмов на постсоветском пространстве прокатчики обратили внимание и закупили некоторые белорусские картины для этой аудитории.

Список исчерпан... У меня нет данных, касающихся интереса публики к телесериалам, но любые дополнительные плюсы не изменяют общую удручающую картину некачественности отечественного кинопроизводства. Имея постоянную государственную поддержку (а это большое преимущество нашего кино перед многими кинематографиями бывших советских республик), белорусский игровой кинематограф не имеет авторитета в профессиональной среде. За все 13 лет, которые проходит в Минске Международный кинофестиваль ***"Лістапад"***, международное жюри кинематографистов не присудило ни одного приза или диплома какой-нибудь ленте "Беларусьфильма"! Знаменательный показатель, не правда ли?..

Причины, по которым так происходит, можно называть разные, но, на мой взгляд, есть две определяющие. А именно: в кино, которое одновременно производит духовный продукт и товарную единицу, нынешняя командно-указующая система управления оказалась малоэффективной. Жесткая идеологическая регламентация вымыла творческую элиту из игрового кино, и прежде всего — режиссерскую. Остались, за редчайшим исключением, исполнители, которым фактически все равно, что снимать. А нужное кино (в советское время сами творцы цинично называли такие фильмы "нужниками"), снятое без озарения, без поиска, без риска, остается лишь плановой единицей и только. Его отправляют пылиться на фильмотечные стеллажи.

Вторая основная причина кроется в неразвитости в Беларуси негосударственного киносектора. В России уже давно делают погоду независимые продюсеры, с которыми тесно сотрудничают государственные структуры, опекающие кино. В конце 1980-х — начале 1990-х годов в Беларуси появилось немало частных кинофирм и студий, но, не имея режима экономического благоприятствования, они быстро самоликвидировались. Рыночные отношения в кинопроизводстве остались в зачаточной стадии. Убеждена: без свободы творческого выбора, без доверия к кинематографистуличности со стороны управленцев да и без конкуренции с независимым продюсерским кино, "Беларусьфильм" еще долго не завоюет престижа на поприще художественной кинематографии...

Что делают «пташуковцы»?

В 2004 году Белорусскую академию искусств окончили с отличными и хорошими результатами семеро воспитанников киномастерской Михаила Пташука. До сего времени ни один из них не был допущен к большому кино.

Учитель и его питомцы. Первый ряд слева направо (сидят): Андрей Голубев, Михаил Пташук, Дмитрий Лось; второй ряд: Людмила Дубровская, Максим Субботин, Александр Кананович, Денис Скворцов.

Каковы их перспективы при новом руководстве "Беларусьфильма"?

Опрос выявил следующую картину.

В мае этого года **Андрей Голубев** предполагает начать съемки военной мелодрамы *"Чаклун и Румба"* по собственному сценарию.

Окрылены надеждой **Дмитрий Лось и Евгений Сетько.** Несколько лет они пытались пробить сценарий своего учителя М.Пташука *"Ангел-хранитель" ("Кремлевские куранты")*. Сценарию уже десять лет с гаком! Пташук написал трагическую киноисторию о том, как в 1943 году на территории Западной Белоруссии никто не хотел умирать, а в 1950-е гнул спину в послевоенном колхозе. Если проект обретет жизнь и окажется успешным, можно будет воскликнуть: наконец-то киностудия вернулась к подлинному отражению событий военного и послевоенного времени!

Еще один "пташуковец" **Денис Скворцов** скорее всего будет снимать картину о современной армии *"Щит Отечества"*.

Людмила Дубровская и **Максим Субботин** находятся в ожидании положительных решений по заявленным темам.

Александр Кананович принял предложение питерского режиссера и продюсера **Алексея Учителя** и работает над литературным материалом в России, но хотел бы получить полнометражный дебют и на родной киностудии.

Таким образом, "Беларусьфильм" начал наполняться мажорными звуками. У меня, признаться, этот фактор вызывает скептицизм. Впрочем, дождемся итогов, которые последуют через год...

Алла БОБКОВА, кинокритик.

АНОНС

Піт Паўлаў запрашае...

28 лютага ў малой зале Палаца Рэспублікі адбудзецца прэзентацыя альбома PETE PAFF "Паглыбленне". Гэта першы вялікі канцэрт гурта ў Беларусі. Распавядае лідэр капэлы Піт Паўлаў.

— Звычайна PETE PAFF іграе ўпяцёх, а на канцэрце будзе поўны склад сапраўднага аркестра — з духавымі, з віяланчэлямі, — гаворыць Піт. — Будзе моцнае, максімальна набліжанае да класічнага гучанне, чаго, па шчырасці, ніколі яшчэ не было. Дагэтуль мы гралі невялічкія канцэрцікі ў невялічкіх клубах, каб не губляць форму і глядзець на рэакцыю слухачоў на нашу творчасць. Але самае цікавае мы прыхавалі менавіта на прэзентацыю дыска.

— Правакацыйнае пытанне: якім чынам удалося атрымаць дазвол на канцэрт у Палацы Рэспублікі?

— Я некалькі месяцаў наведваўся ў спецыяльную камісію па выданні дазволаў на канцэрт, прынёс туды свой дыск, крытыку на яго. Гэты альбом падкрэслена народны, этнічны, таму, каб знайсці ў ім палітычны падтэкст, трэба мець занадта моцнае ўяўленне і звязваць з палітыкай беларускую мову. Бо гэта музыка ў чыстым выглядзе.

— Як думаеце, ці збераце поўную залу?

— Гэта, на жаль, залежыць ад рэкламы. У гурта PETE PAFF не так ужо шмат прыхільнікаў, але тыя, што ёсць, маглі запоўніць залу. Трэба толькі, каб яны ведалі пра канцэрт. Калі я прыходжу на радыё, каб расказаць пра новы дыск, пра канцэрт, мяне адразу накіроўваюць у рэкламны аддзел. І гэта сумна...

Па шчырасці, з гэтага канцэрта мы не разлічваем зарабіць вялікія грошы. Гэта не камерцыйны праект. Дарэчы, квіткі даволі танныя — ад 11 да 15 тысяч рублёў. Найперш мы хочам заахвоціць людзей, каб яны прыйшлі і паслухалі, зацікавіліся гэтым. На жаль, вельмі распаўсюджанае меркаванне, што Піт Паўлаў — гэта проста гітарыст *"N.R.M."* і нічога цікавага больш зрабіць не можа. Прычым так лічаць людзі, якія наогул не знаёмыя з маёй уласнай творчасцю. На маю думку, тыя, хто хоць раз паслухаў *"GARADzKIJA"*, адразу робяцца іх прыхільнікамі. Я намагаюся пераканаць, што магу больш, і гэта насамрэч так. Прыходзьце на канцэрт, і вы самі ўсё ўбачыце!

Вальжына КОРСАК.

ПОСТФАКТУМ

Минск в молоке

На днях в Беларуси с концертами побывала известная группа "Би-2".

Они порадовали своих поклонников песнями из последнего альбома "Молоко", а также наиболее полюбившимися композициями прошлых лет. Несмотря на усталость от переездов по городам Беларуси и ежедневных концертов, Лева и Шура на сцене выкладывались по полной, приводя в восторг зрителей. Под песню *"Прощай, Берлин"* Лева попросил включить подсветку в мобильных телефонах или зажигалки. В результате пространство Концертного зала "Минск" превратилось в "небо над Берлином". Поклонники группы также в долгу не остались: повсюду были развешаны плакаты, над головами реяли флаги с символикой группы, а по залу летали шарики. Один немолодой мужчина и вовсе вскочил со своего места и принялся выделывать зажигательные па, чем немало повеселил не только зрителей, но и самих музыкантов.

А перед концертом Лева и Шура пообщались с журналистами.

Музыканты признались, что немного устают от постоянных гастролей и разъездов.

"Поэтому сейчас стараемся работать в более щадящем режиме, — уточнили Шура и Лева. — *Но, с другой стороны, кроме записей пластинок, съемок клипов и гастролей, у нас больше занятий каких-то особых и нет..."*

Также участники "Би-2" не исключают, что когда-нибудь посвятят песню Беларуси.

"Вообще-то, мы по своей натуре космополиты и не хотим посвящать песни какой бы то ни было стране. Мы посвящаем их только самим себе — своим чувствам, мыслям... Конечно, если у нас будет такое настроение, мы посвятим песню Беларуси..."

Ольга ПРУДНИКОВА.

ЗА КАДРАМ

Ці пойдзе Волчак у дэпутаты?

У эфіры Агульнанацыянальнага тэлебачання працягваюцца трансляцыі першага ў Беларусі рэаліці-шоу "Зорны цырк". Як вядома, склад журы ў гэтым праекце мяняецца кожны тыдзень. Для ўдзелу ў чацвёртай перадачы была запрошана старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына.

Лідзія Міхайлаўна ні на секунду не забывае, якую адказную пасаду займае. Вядучы шоу Ягор Хрусталёў прапанаваў ёй пракаменціраваць выступленне артыста Георгія Волчака. Трэба адзначыць, што нумар у яго быў даволі складаны. Яму трэба было ўтрымацца на круглай жалезнай катушцы, на якой зверху ляжалі драўляныя лаўкі. І Волчаку гэта ўдалося.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі пракаменціравала выступленне Георгія Волчака ў сваім стылі: "Для палітыка адна з галоўных якасцяў — умець балансіраваць. У нашага канкурсанта гэта атрымалася". І тут жа дадала: "У будучым годзе ў нас выбары дэпутатаў. Цэнтральная выбарчая камісія будзе рада бачыць сярод кандыдатаў і Георгія Волчака".

Па нашай інфармацыі, Георгій Волчак у дэпутаты не збіраецца. Па меншай меры, пакуль... Праўда, ці зможа ён устаяць супраць прапановы Лідзіі Міхайлаўны, пакажа час...

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

КАЗУС

Саша Немо угнал свою машину

По пути на концерт певец Саша Немо решил заправить машину на придорожной автозаправке. Подъехал в колонке, вышел из автомобиля и направился к кассе. Залил в бак бензин и уже собрался ехать дальше. Дернул за ручку, а дверь не открывается.

"Я начал искать в карманах ключи, но не нашел, — говорит Саша. — *Потом увидел, что они остались в салоне. Оказалось, когда выходил из машины, нечаянно локтем задел внутренний замок. И когда захлопнул дверь, она автоматически закрылась изнутри. Что делать? За мной уже начала очередь собираться. Не возьму же я машину на руки и не отнесу ее в сторону! Обратился за помощью к работникам заправки. Общими усилиями полукриминальным способом вскрыли автомобиль. Правда, как именно — не скажу. Не хочу, чтобы кто-то другой воспользовался этим секретом и укатил на моем новом авто в неизвестном направлении".*

Кстати, помимо нового авто у Саши Немо на подходе и новые песни. Одна из них сольная, а вторая — в дуэте с очаровательной **Аней Шаркуновой.**

Татьяна КУРБАТ.

ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

Прамы эфір Паўла Рудзені

"Дзень добры, зноў у прамым эфіры Павел Рудзеня. Гэта "Мясцовае радыё". Сёння мы будзем тэлефанаваць розным людзям — пытацца, што яны зрабілі б, калі б знайшлі 300 тысяч еўра, як гэта здарылася з адной жанчынай з Расіі. Яна знайшла ўладальніка гэтых грошай і аддала яму знойдзенае. А што зрабілі б жыхары нашай краіны?" — з такім пытаннем да слухачоў са сваёй уласнай кватэры ў прамым эфіры звяртаўся малады дзі-джэй.

Канешне, ён такіх грошай, мабыць, ніколі ў сваім жыцці не ўбачыць. Ды ён наогул ніколі і нічога не ўбачыць...

...24 жніўня ў 23.50 нарадзіўся хлопчык. Усё было добра: дзве рукі, дзве нагі. Але праз чатыры месяцы маці заўважыла, што дзіця не рэагуе на тое, што адбываецца навокал. Ён сляпы. Дактары толькі разводзілі рукамі: і маці бачыць, і бацька, і старэйшая сястра, а хлопец — не. Маці Паўла толькі потым выказала думку, што, можа, гэта ўсё здарылася з-за мужа, які шмат біў яе і некалькі разоў моцна пападаў і па жываце, дзе ужо жыў маленькі чалавечак...

"Мне з самага дзяцінства жылося цяжка, — распавядае Паша. — *Бацька шмат піў. Маці дзень і ноч працавала, каб пракарміць нас з сястрою. Калі мне было дзесяць гадоў, бацька памёр".*

Паша з самага нараджэння не адчуваў сябе нейкім іншым, не падобным да другіх дзяцей. Хоць і вучыўся ў спецыялізаванай школе ў Гродне, шмат часу праводзіў з суседскімі дзецьмі. Катаўся на веласіпедзе, лазіў па дрэвах і ўсё рабіў так, як робяць простыя хлопчыкі. У школе вучыўся выдатна.

"Яшчэ ў школе мы з сябрамі самі зрабілі радыё. Ужо тады я зразумеў, што гэтым і хачу займацца ўсё жыццё. Потым, калі скончыў школу, вырашыў зрабіць сваю мару яўнай", — гаворыць Паша.

Але гэта ж няпростая справа — стварыць радыё. Трэба ісці ў Міністэрства інфармацыі, атрымліваць ліцэнзію. І Паша пайшоў. Спачатку яму сказалі, што трэба сабраць подпісы жыхароў дома. Ён сабраў: усе, акрамя трох чалавек, з задавальненнем слухалі б свайго дзі-джэя. Потым сказалі дабыць подпіс начальніка ЖЭСа. Хлопчыку і гэта ўдалося. Аднак пасля гэтага ў міністэрстве Пашы паказалі на дзверы і сказалі, што гэтая хваля ім самім патрэбна. Вось так наша дзяржава дапамагае моладзі!

"У нашай краіне вельмі цяжка жыць. Я маю інваліднасць першай групы. Пенсія па інваліднасці складае 160 тыс. у месяц. Я ж не працую. Бывае толькі граю ў пераходах з сябрамі. Я пяць гадоў вучыўся па класе трубы. Трэба ж неяк маці дапамагаць..." — распавядае пра сваё жыццё Паша.

Але ён ніколі не ўпадае ў дэпрэсію. Вось ужо некалькі год у Курасоўшчыне ў прамы эфір выходзіць нелегальны дзі-джэй са сваім нелегальным "Мясцовым радыё". Яго студыя — гэта маленькі пакой-спальня. У студыі "Мясцовага радыё" вельмі часта збіраюцца знакамітыя госці — **Іна Афанасьева, "Тяни-Толкай", Алеся**. Многія дапамагаюць і матэрыяльна.

*"Асабліва мне дапамог і дапамагае **Аляксандр Ціхановіч,*** — гаворыць Паша. — *Калі б ён не даваў грошай, мабыць, зараз і не было б майго радыё. Але ёсць, канешне, і тыя, хто нават размаўляць са мной не хоча. Шмат разоў зваў да сябе групу **"Лепрыконсы"** ці **Кірыла Слуку,** а мне толькі кажуць, што вось калі я буду вяшчаць на ўвесь Мінск, тады яны падумаюць".*

Зараз жа Паша Рудзеня марыць аб працы на якой-небудзь нацыянальнай радыёстанцыі. І аб тым, каб калі-небудзь стварыць радыё — з вялікімі студыямі, з сапраўдным штатам журналістаў. *"І хто ведае — можа, калі-небудзь мае мары спраўдзяцца..."* — загадкава ўсміхаецца Павел.

Лілія ВАЛКОНСКАЯ.

РЭДКАЯ ТЭМА

Метэарыт у падарунак

Падарункі прымаць, канечне, прыемна, але раз-пораз хочацца, каб падораная рэч была незвычайнай.

Калі вы хочаце зрабіць дарагому чалавеку незвычайны падарунак, то чаму б не падырыць... метэарыт. Тым больш што магчымасць для гэтага ёсць. У Беларусі працуе інтэрнет-крама, якая гандлюе "касмічнымі камянямі". Карэспандэнт "Народнай волі" сустрэўся з яе ўладальнікам **Віталем ГЕРМАНОВІЧАМ**.

«Попыт даволі сціплы»

— Як, напэўна, усе дзеці, я ў дзяцінстве захапляўся космасам. Гэтае захапленне захавалася і ў дарослым жыцці, — расказвае Віталь. — А метэарыты, калі казаць проста, — адзін з касмічных накірункаў. Калі не ўдавацца ў падрабязнасці і даць вызначэнне метэарыту простай мовай, то гэта — кавалак каменя альбо жалеза, які зваліўся на зямлю з космасу. Дарэчы, калі вы трымаеце ў руках каменны метэарыт, то не заўжды можаце пра гэта здагадацца. Каменныя метэарыты выглядаюць як звычайныя камяні. Жалезныя метэарыты — больш рэдкія і каштоўныя, бо самароднае жалеза ў прыродзе ўвогуле не сустракаецца.

— Віталь, а як метэарыты трапляюць у вашу краму?

— Ведаеце, я не стаўлю перад сабой абавязковай мэты прадаць метэарыт. Іх я набываю для ўласнай калекцыі, якая складаецца прыкладна з трох дзесяткаў экспанатаў. Нешта выстаўляю на продаж. У асноўным калекцыю папаўняю праз таргі на аўкцыёнах у Інтэрнеце.

— Добра. Скажам, чалавек вырашыў набыць метэарыт. Як Вы запэўніваеце яго, што гэта менавіта і ёсць метэарыт, а не звычайны камень?

— Канечне, існуе сертыфікацыя метэарытаў. У Беларусі яе можна зрабіць у Інстытуце геалогіі пры Акадэміі навук. Там, дарэчы, і музей метэарытаў ёсць. Пасля адпаведнага аналізу Вам пацвердзяць, ці з'яўляецца метэарыт аўтэнтычным.

— А з якіх паказчыкаў складаецца кошт метэарыта? Чым большы па памеры, тым дарагэйшы?

— Не, не зусім так. Усё залежыць ад рарытэтнасці, эксклюзіўнасці. Напрыклад, калі даказана, што той ці іншы метэарыт адкалоўся ад Месяца ці Марса і знаходзіцца на Зямлі ў адзіным экземпляры, то яго кошт можа складаць тысячы і нават дзесяткі тысяч долараў. Праўда, такіх дарагіх метэарытаў у маёй калекцыі няма.

...Неяк у старажытнасці, калі на зямлю ўпаў метэарыт і калі мясцовыя жыхары прыцягнулі яго ў горад, то ўлады загадалі прывязаць яго ланцугамі да мясцовага замка. Каб не дай Бог метэарыт не ўляцеў назад у неба... Каб і ваш метэарыт нікуды ад вас не дзеўся — купіце яго. Блізкія будуць задаволены такім незвычайным падарункам.

У інтэрнет-краме метэарытаў пакупнікам прапануюць як жалезныя, так і каменныя метэарыты. Каменны метэарыт Кальцова, які быў знойдзены жыхарамі Падмаскоўя ў 2004 годзе, важыць амаль 90 грамаў і каштуе 240 долараў ЗША.

Сярод жалезных метэарытаў цэннік вагаецца ў межах ад 190 да 520 долараў. Тут можна вылучыць Сіхотэ-Алінскі метэарыт, які ўваходзіць у дзесятку самых вялікіх метэарытаў, знойдзеных на сённяшні дзень. Гэты нябесны камень упаў на зямлю 12 лютага 1947 года. Па дарозе да месца сустрэчы з зямлёй ён рассыпаўся на сотні тысяч абломкаў і выпаў дажджом. Увогуле, жалезны метэарыт — рэдкасць, а жалезны дождж — з'ява зусім унікальная. Месца яго падзення было знойдзена праз дзень, а праз тыдзень на месцы працавалі даследчыкі. Гэты метэарыт дасканала даследаваны, пра яго напісана мноства манаграфій. Больш падрабязную інфармацыю аб таварах інтэрнет-крамы можна атрымаць у Інтэрнеце па адрасе http://meteor.n1.by.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

АСОБА

Марыя Шарапава думае пра беднасць

Тэнісістка Марыя Шарапава ахвяравала 100 тысяч долараў на ажыццяўленне васьмі праектаў для моладзі ў сельскіх раёнах Беларусі, Расіі і Украіны, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Пра гэта, як паведамляе прэс-служба прадстаўніцтва ААН у Беларусі, спартсменка аб'явіла на цырымоніі прызначэння яе паслом добрай волі Праграмы развіцця ААН (ПРААН).

"Мой першы крок — дапамога раёнам, што пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі, дзе ў маёй сям'і ёсць карані, — сказала тэнісістка. — *Зараз менавіта беднасць і адсутнасць магчымасцяў сталі галоўнай праблемай для мясцовай моладзі".*

Як паведамляе прэс-служба, ПРААН будзе мець асноўную ролю ў рэалізацыі гэтых прынцыпаў, працуючы ў партнёрстве з мясцовымі і рэгіянальнымі ўладамі, грамадскімі арганізацыямі і маладзёжнымі групамі. Ахвяраваныя М.Шарапавай сродкі будуць выкарыстаны для фінансавання праектаў у галіне камп'ютэрызацыі і экалагічнай адукаванасці, а таксама аднаўлення спартыўных збудаванняў і бальніц у трох краінах, якія больш за ўсё пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ЗАКУЛІССЕ

Князь Усяслаў вернецца ў Полацк. На кані

За права ўвайсці ў гісторыю нацыянальнага мастацтва змагаюцца тры сталічныя скульптары

Народ, які не мае коннага помніка свайму нацыянальнаму герою, наўрад ці можа лічыцца суверэнным, нават калі ў наяўнасці ўсе іншыя атрыбуты Незалежнасці — герб, сцяг, гімн, амбасады ў чужых сталіцах, прадстаўніцтва ў ААН. Калі няма такога помніка, значыць, этнас яшчэ не ўсвядоміў сябе нацыяй, не адчуў сябе "на кані".

Ставіць на пастамент героя на кані першымі дадумаліся ў Старажытным Рыме. "Бацькам" усіх конных помнікаў свету лічыцца бронзавы імператар Марк Аўрэлій, які стаіць зараз на плошчы Капітолія італьянскай сталіцы. Парадаксальна тое, што імператар, увасоблены як вершнік-ваяр, у гісторыі больш вядомы як філосаф, чым як правадыр легіёнаў.

Конных помнікаў у свеце процьма, але сусветна вядомых няшмат. Акрамя названага вышэй Марка Аўрэлія гэта помнік кандацьеру Гатэмалата ў Падуі (скульптар Данатэла) і кандацьеру Калеоні ў Венецыі (скульптар Верокіа), Пятру Першаму (Фальканэ) і Аляксандру Трэцяму (Трубяцкі) у Пецярбургу, генералу Альвеару ў Буэнас-Айрэсе (Бурдэль) — вось, бадай, і ўсё. Хоць, мабыць, кожны патрыёт захоча далучыць да гэтага спісу свайго героя-вершніка. Украінцы — помнік гетману Багдану Хмяльніцкаму ў Кіеве, расійцы — заснавальніку іхняй сталіцы князю Юрыю Далгарукаму (у Маскве на Цвярской); армяне — Давіду Сасунскаму, герою нацыянальнага эпасу (стаіць у Ерэване перад вакзалам), грузіны — дзяржаўным дзеячам сярэднявечча цару Вахтангу Гаргасалі (у Тбілісі) і князю Георгію Саакадзе (у Каспі). Беларусы каб і хацелі падсуседзіцца да гэтай кампаніі, дык няма чым. У Беларусі няма ніводнага коннага помніка.

Такім бачыць Усяслава скульптар Алесь Шатэрнік.

Але цалкам магчыма, што ў бліжэйшы час наша дзяржава нарэшце прыдбае гэты атрыбут духоўнага суверэнітэту. У Полацку мусіць з'явіцца конны помнік князю Усяславу, легендарнай і загадкавай постаці нашай даўняй гісторыі. Гаворка пра гэта ідзе даўно. Па словах скульптара Алеся Шатэрніка, яшчэ напрыканцы 80-х гадоў ён спрабаваў (даволі паспяхова) схіліць кіраўніцтва Полацка ўшанаваць помнікам памяць вялікага князя. Адным з аргументаў на карысць помніка было тое, што Усяслаў услаўлены ў "Слове пра Ігаравы паход". Вось з канца 80-х спадар Алесь і працуе над вобразам героя Полацкай Русі. Шансы скульптара ўпрыгожыць Полацк першым у Беларусі конным помнікам значна ўзраслі пасля таго, як ён паставіў у горадзе скульптурную групу "Крывічы", прыхільна прынятую гараджанамі. На дадзены момант ужо існуе рабочая мадэль помніка. Да пэўнага часу яна цалкам задавальняла заказчыкаў. Але нечакана Шатэрніку прапанавалі перарабіць скульптуру. Канкрэтна — замяніць меч у руках князя на кап'ё. Маўляў, Усяслаў, які трымае меч як крыж, нагадвае помнік заснавальніку горада Барысава (аўтар — Анатоль Арцімовіч). Задаволіць прэтэнзіі Шатэрнік наадрэз адмовіўся. Ягоныя аргументы: меч — не толькі зброя, але найперш сімвал улады, а кап'ё — увогуле зброя не княжацкая, падабенства мяча і крыжа вызначае вобразны лад шмат якіх манументаў — і нікога гэта не бянтэжыць. На добры лад можна было б дамовіцца, але тады размовы не атрымалася... Можна меркаваць, што справа была не ў трактоўцы вобраза, а ў асобе аўтара. Рэч у тым, што Шатэрнік не хаваў свайго ўдзелу ў шэрагу нонканфармісцкіх мастацкіх праектаў.

Потым полацкія ўлады наладзілі конкурс, у якім Шатэрнік не здолеў узяць удзел, бо ў гэты час знаходзіўся за межамі краіны. У конкурсе спаборнічалі толькі два скульптары — Сяргей Бандарэнка і Аляксандр Прохараў. Спачатку былі звесткі, што перамог Бандарэнка, а потым — што ставіць будуць помнік работы Прохарава. Вызначаны і тэрмін устаноўкі помніка.

Гэты праект — плён рэгіянальнага патрыятызму, жадання палачан вярнуць свайму гораду забытую славу.

Такі патрыятызм, безумоўна, трэба шанаваць і падтрымліваць. Але ў межах здаровага сэнсу. Напрыклад, пабудова ў Полацку помніка Святой Еўфрасінні (аўтар — скульптар Голубеў) была авантурай, санкцыянаванай мясцовай уладай. Меркаванні мастацкіх экспертаў, аб'яднаных у савет пры Міністэрстве культуры, у Полацку папросту праігнаравалі. Потым быў скандал. Скульптара Голубева калегі нават хацелі выгнаць з Саюза мастакоў за безгустоўнасць і відавочнае парушэнне прафесійнай этыкі. І ёсць за што: Святая Еўфрасіння трымае крыж як амонавец дубец. Ды і твар Святой не свеціцца інтэлектам... Зараз не ведаюць, што з гэтым помнікам рабіць. На добры лад трэба было б знесці, каб не псаваў гістарычны краявід. Але да яго ўжо прызвычаіліся (такая ўжо чалавечая натура). І галоўнае — грошы заплачаны.

Сяргей Бандарэнка, Алесь Шатэрнік і Аляксандр Прохараў як мастакі класам нашмат вышэй за аўтара згаданага помніка Еўфрасінні, але ўсё адно не варта выпускаць сітуацыю з-пад кантролю цэнтра. Бо помнік, які распачне новую эпоху ў манументальнай пластыцы Беларусі і стане адным з сімвалаў Незалежнасці, павінен быць шэдэўрам.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

P.S. *Днямі Алесю Шатэрніку патэлефанавалі з Полацка і прапанавалі прыняць удзел у чарговым бліц-конкурсе на лепшае рашэнне помніка князю Усяславу. Зразумела, што скульптар згадзіўся. Возьмуць удзел у бліц-конкурсе тры ўжо названыя мастакі альбо кола канкурсантаў пашырыцца — пакуль невядома.*

ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

Кантрапункты Валера Дранчука

У Мінску ў Чырвоным касцёле пачала працу фотавыстава беларускага эколага Валера Дранчука "Мае кантрапункты", прысвечаная нацыянальным паркам ЗША.

"Сваёй выставай я хацеў спраецыраваць амерыканскае стаўленне да прыроды на наш досвед збяражэння так званых асабліва ахоўных прыродных асяродкаў, — сказаў на адкрыцці экспазіцыі аўтар. — *Я таксама хацеў, каб выставу не толькі глядзелі, але і чыталі". Практычна кожная работа мае актуальны аўтарскі каментар, у якім праводзяцца паралелі ўбачанага ў Амерыцы з тым, што адбываецца ў Беларусі".*

Стварэнне ў ЗША нацыянальных паркаў беларускі эколаг называе "самай вялікай ідэяй за ўсю гісторыю Амерыкі". Акрамя нацыянальных паркаў, якія займаюць плошчу, роўную Германіі, у ЗША таксама 545 запаведнікаў, тысячы сховішчаў для звяроў і рыб, нацыянальных лясоў. *"Некаторыя з ахоўных асяродкаў цалкам аддадзены навуковым установам і універсітэтам, навука там займаецца і вывучэннем прыроды, і яе збяражэннем",* — распавёў Валер Дранчук.

Выстава праходзіць у відэазале касцёла Святых Сымона і Алены (Чырвоны касцёл) і працягнецца да канца лютага.

БелаПАН.

СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

Аляксандр Глеб сустрэўся з каралевай Вялікабрытаніі

Напрыканцы мінулага тыдня каралева Вялікабрытаніі Елізавета II прыняла ў Букінгемскім палацы футбалістаў лонданскага "Арсенала", за які гуляе і беларус Аляксандр Глеб.

"Арсенал" стаў першым футбольным клубам, які каралева запрасіла ў сваю рэзідэнцыю на так званае мерапрыемства — "папіць гарбаты". Яшчэ раней, у кастрычніку мінулага года, кіраўніцтва "Арсенала" запрашала Елізавету II на адкрыццё свайго новага стадыёна "Emirates Stadium", аднак, на жаль, каралева тады захварэла і не змагла прыйсці на ўрачыстасць, адправіўшы замест сябе мужа, герцага Эдынбургскага.

А вось "Арсенал" у поўным складзе пагасціў у Букінгемскім палацы. Аляксандр Глеб заявіў, што каралева пацікавілася ў яго: "Ты з Беларусі? Я ведаю гэтую краіну і нават была ў вашым пасольстве".

"Саша, натуральна, у захапленні ад візіту да каралевы, — распавядае бацька футбаліста, **Павел Рыгоравіч ГЛЕБ**. — *Патэлефанаваў, кажа: "Усё было проста цудоўна. Ды і не кожны ж дзень у Елізаветы II гасцюем". Пахадзілі яны там, карціны розныя паглядзелі, якія каштуюць дзесяткі мільёнаў долараў, з каралевай пагутарылі. Яна ж такая эпатажная дама!.. Я нават і не пытаў у сына, ці спадабалася яму Елізавета II — яму ж на ёй не жаніцца. А так, паўтаруся, усё было на вышэйшым узроўні".*

Алесь СІВЫ.

"Нізкі Вам паклон, каралева, ад усяго беларускага народа!" (нападаючы "Арсенала" Анры прадстаўляе Елізавеце II Аляксандра Глеба).

Фота з сайта лонданскага "Арсенала".

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У сакавіку — з «Народнай воляй»!

Яшчэ раз папярэджваем: хто не зрабіў **перадаплату** за сакавіцкія нумары, зрабіце гэта, калі ласка, у бліжэйшыя дні. Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апературыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

БУДЬТЕ БДИТЕЛЬНЫ!

Кража по расписанию

Карманные кражи в метро — явление нередкое. Однако, как утверждают специалисты, защитить свое имущество возможно: воры идут "на дело" приблизительно в одно и то же время и даже на одних и тех же станциях.

Как рассказал корреспонденту агентства "Минск-Новости" заместитель начальника ОВД по охране минского метрополитена Владимир Шаруба, чаще всего это неброско одетый неприметный мужчина 25—35 лет. Обычно воры орудуют на станциях "Площадь Ленина", "Октябрьская", "Площадь Якуба Коласа" и "Институт культуры", выбирая первый или последний вагоны — они, как правило, самые людные. Среди дней недели у злоумышленников тоже есть предпочтения: понедельник и четверг. А вот воскресенье они не жалуют — соответственно, краж в этот день происходит меньше.

*Калектыў выдавецкага прыватнага унітарнага прадпрыемства "Народная воля" выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы Таццяне Ясючэні з нагоды смерці яе **маці**.*

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 21.02.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 11 000 экз. Заказ №